| | Не павінна прымаць удзел у вайне ні на адным з бакоў | 84% | ↑ 95% | 96% | ↑ 91% |
| Як вы лічыце, які з бакоў на дадзены момант перамагае ў | Перамагае Украіна | 1% | 1% | ↓ 6% | 48% |

[124] Пытанні былі зададзеныя незалежна адно ад аднаго, таму сума долей можа не даваць 100%

| | | Зацятыя прыхільнікі | Схільныя давяраць | Схільныя не давяраць | Зацятыя праціўнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| расійска-украінскай вайне? | Перамагае Расія | 54% | 39% | 14% | 4% |
| | Знаходзяцца прыкладна ў роўнай пазіцыі | 8% | 8% | 21% | 20% |
| | Цяжка адказаць | 37% | 53% | ↑59% | ↑27% |
| Ці згодныя вы з наступным выказваннем: «Расія зрабіла памылку, распачаўшы ваенныя дзеянні ва Украіне ў 2022 годзе»? | Цалкам не згодны(ая) | 34% | 16% | 10% | 4% |
| | Хутчэй не згодны(ая) | ↑47% | 43% | 21% | 3% |
| | Хутчэй згодны(ая) | 14% | 34% | 37% | 13% |
| | Цалкам згодны(ая) | 5% | 7% | 33% | 81% |
| У новай фазе баявых дзеянняў ва Украіне, што пачалася 24 лютага 2022 года, вы хутчэй падтрымліваеце Украіну ці Расію? Ці ні адну з краін у поўнай ступені? | Хутчэй Украіну | 1% | 1% | 17% | 69% |
| | Хутчэй Расію | 60% | 44% | 11% | ↓0,3% |
| | Ні адну з іх у поўнай ступені | 19% | 26% | 42% | 22% |
| | Цяжка адказаць | 20% | ↑29% | 30% | 8% |

Пры гэтым на пытанне, ці зрабіла Расія памылку, распачаўшы вайну 24 лютага 2022 года, **Зацятыя прыхільнікі** ўлады адказваюць менш адназначна, у той час як **Зацятыя праціўнікі** цалкам згодныя, што гэта было памылкай (Табліца 2). Гэта можа сведчыць пра розную прыроду падтрымкі ў дадзеных групах. То-бок прыхільнікі рэжыму падтрымліваюць Расію, хаця і сумняюцца, ці не было рашэнне аб уварванні памылкай, у той час як праціўнікі маюць больш паслядоўнае меркаванне, асуджаючы Расію як у самім рашэнні, так і ў бягучай сітуацыі. У сувязі з гэтым пазіцыя праціўнікаў дзеянняў Расіі можа быць больш трывалай, таму што ім не прыходзіцца пераадольваць сумневы і супярэчнасці.

У параўнанні з папярэднім замерам значных змен ва ўспрыманні вайны няма. **Схільныя не давяраць** і **Зацятыя праціўнікі** пачалі на некалькі адсоткаў часцей пазначаць «цяжка адказаць» у пытанні пра бок, які перамагае (Табліца 2), але гэта невялікія змены, таму пра дынаміку пакуль казаць рана.

Нягледзячы на факт, што стаўленне да вайны застаецца адной з кантраверсійных тэм для бакоў сацыяльнага канфлікту, існуе тое, што іх аб'ядноўвае, – антываенны кансэнсус. Пад ім мы маем на ўвазе непрынянцце ідэі прамога ўмяшання беларускага войска ў канфлікт. Так, пераважная большасць рэспандэнтаў ва ўсіх сегментах адказвае, што армія Беларусі не павінна прымаць удзел у вайне. У параўнанні з мінулым замерам назіраецца хістанне прапорцый у некалькі адсоткаў, якое, хаця і з'яўляецца статыстычна значным, не ўплывае на агульную карціну (Табліца 2). Існаванне кансэнсусу пацвярджаецца і іншымі даследаваннямі. Так, у даследаванні Беларускай аналітычнай майстэрні ідзе гаворка пра 80% праціўнікаў ідэі ўвода беларускага войска ва Украіну[125].

[125] Часть 2. Геополитические ориентации и отношение к войне в Украине // Belarusian Analytical Workroom, 2023

Другая важная тэма, звязаная з вайной, якая хутчэй аб'ядноўвае ўсе палітычныя сегменты, – гэта расійская ядзерная зброя. Можна з упэўненасцю сказаць, што рэжым не здолеў выклікаць у грамадства прыхільнасць да ідэі размяшчэння ядзернай зброі ў Беларусі. Амаль поўны кансенсус па гэтым пытанні адлюстроўвае[126] даследаванне Chatham House у сакавіку 2023 года (75% супраць). У сваю чаргу, наша даследаванне паказвае, што агульная грамадская думка па гэтым пытанні не змянілася за трэці квартал 2023 года (Малюнак 6). Апрача таго, непублічныя вынікі тэлефонных апытанняў таксама паказваюць, што расійская ядзерная зброя – найменш дыскусійнае пытанне без відавочнай перавагі ў бок прыняцця ці непрыняцця[127].

Малюнак 6. Стаўленне да выказвання «Я ўхваляю размяшчэнне ядзернай зброі на тэрыторыі Беларусі»




Наколькі вы згодныя альбо не згодныя з наступным сцверджаннем: «Я ўхваляю размяшчэнне ядзернай зброі на тэрыторыі Беларусі»?

Пры гэтым паволі змяняецца стаўленне да пытання ядзернай зброі сярод асобных палітычных сегментаў (Малюнак 6). Як мы і прагназавалі ў папярэдняй справаздачы, **Зацятыя прыхільнікі** рэжыму паволі прымаюць наратыў улады: сярод іх значна паменшылася доля тых, хто цалкам не згодны з перамячшэннем зброі (Малюнак 6). Сярод **Схільных не давяраць** доля тых, хто ўхваляе размячшэнне зброі, крыху знізілася за кошт павелічэння долі няўпэўненых у адказе. Так, за мінулы квартал назіраецца невялікая палярызацыя палітычных сегментаў па гэтым пытанні.

Такім чынам, нягледзячы на адрознае ўспрыманне вайны, антываенны кансэнсус застаецца трывалай пазіцыяй, якая аб'ядноўвае беларусаў. Адсутнасць адназначнай падтрымкі размяшчэння расійскай ядзернай зброі таксама застаецца заўважнай, аднак з цягам часу пытанне ядзернай зброі можа стаць чарговым фактарам, што паспрыяе палярызацыі ў грамадстве.

---

[126] Отношение беларусов к войне и ценностные ориентации // Chatham House, март 2023

[127] Інтэрв'ю з аўтарам рэпрэзентатыўнага тэлефоннага апытання, лета 2023

## ДАСВЕДЧАНАСЦЬ У ПАДЗЕЯХ

Мы прапанавалі рэспандэнтам восем фактаў і папрасілі па кожным з іх ацаніць свой узровень інфармаванасці: «добра інфармаваны пра падзею», «штосьці чуў», «першы раз чую», «упэўнены(ая), што такой падзеі не было». Пасля гэтага мы пабудавалі індэкс дасведчанасці, які вагаецца ад -1 да 1, дзе -1 – «слабая дасведчанасць ва ўсіх падзеях», а 1 – «выдатная дасведчанасць ва ўсіх падзеях» (Малюнак 7).

Малюнак 7. Індэкс дасведчанасці сярод сегментаў сацыяльнага канфлікту




Так, мы бачым, што большая частка грамадства хутчэй не ведае аб падзеях навокал сябе (Табліца 3). Асабліва яскрава гэта выяўляецца, калі гаворка ідзе пра падзеі ў лагеры дэмакратычных сіл. Для ілюстрацыі возьмем падзею «Раздзяленне арганізацыі ByPol на дзве новыя арганізацыі – ByPol і BelPol»: толькі палова з **Зацятых праціўнікаў** адказалі, што нешта ведаюць пра падзею (адказы іншых сегментаў выяўляюць ящчэ меншую дасведчанасць). Навіна аб прызнанні некаторых твораў Дуніна-Марцінкевіча, Геніюш і Арсенневай «экстрэмісцкімі матэрыяламі» таксама дайшла не да многіх рэспандэнтаў.

Табліца 3. Інфармаванасць пра некаторыя падзеі

Значна больш, чым сярод іншых сегментаў

| | | Зацятыя прыхіль-нікі | Схільныя давяраць | Схільныя не давяраць | Зацятыя праціў-нікі |
|---|---|---|---|---|---|
| Раскол ByPol на дзве арганізацыі – ByPol и BelPol | Не адбывалася ўвогуле | 4% | 6% | 6% | 1% |
| | Першы раз чую | 89% | 82% | 76% | 44% |
| | Штосьці чулі | 7% | 11% | 16% | 30% |
| | Добра інфармаваны | 0.4% | 0.4% | 2% | 25% |
| Прызнанне некаторых твораў Дуніна- | Не адбывалася ўвогуле | 4% | 5% | 11% | 5% |
| | Першы раз чую | 78% | 74% | 62% | 41% |

| | | Зацятыя прыхільнікі | Схільныя давяраць | Схільныя не давяраць | Зацятыя праціўнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| Марцінкевіча, Геніюш і Арсеневай «экстрэмісцкімі» | Штосьці чулі | 15% | 20% | 23% | 28% |
| | Добра інфармаваны | 3% | 1% | 5% | 26% |
| Выдача Міжнародным крымінальным судом ордэра на арышт Уладзіміра Пуціна | Не адбывалася ўвогуле | 18% | 14% | 9% | 8% |
| | Першы раз чую | 48% | 48% | 44% | 17% |
| | Штосьці чулі | 21% | 28% | 32% | 22% |
| | Добра інфармаваны | 13% | 11% | 15% | 53% |
| Парушэнне двума баявымі верталётамі беларускай арміі дзяржаўнай мяжы Польшчы ў жніўні 2023 года | Не адбывалася ўвогуле | 19% | 12% | 8% | 3% |
| | Першы раз чую | 46% | 54% | 44% | 32% |
| | Штосьці чулі | 29% | 32% | 42% | 35% |
| | Добра інфармаваны | 6% | 2% | 6% | 30% |

Перад вамі некалькі падзей. Вы добра ведаеце, штосьці чулі ці ўпершыню чуеце пра кожную з іх? Альбо вы мяркуеце, што гэтага ўвогуле не адбывалася?

Разам з тым, калі мы параўнаем інфармаванасць пра ваенны мяцеж Прыгожына ці размяшчэнне байцоў групы «Вагнер» у Беларусі (пра гэтыя падзеі беларусы ведаюць прыблізна аднолькава), мы пабачым, што большасць беларусаў прынамсі нешта чулі пра гэта.

## Малюнак 8. Інфармаванасць пра размяшчэнне байцоў групы «Вагнер» у Беларусі




Перад вамі некалькі падзей. Вы добра ведаеце, штосьці чулі ці ўпершыню чуеце пра кожную з іх? Альбо вы ўпэўненыя, што гэтага не адбывалася ўвогуле? Размяшчэнне салдат групы (ПВК) «Вагнер» на тэрыторыі Беларусі

Гэта сведчыць пра тое, што ў інфармацыйную прастору большасці Беларусаў трапіла адна з самых галоўных і драматычных падзей лета 2023 года, а таксама навіны пра яе развіццё, што непасрэдна закранула Беларусь.

## СТАЎЛЕННЕ ДА ГРУПЫ «ВАГНЕР»

На фоне высокай дасведчанасці можна дапусціць, што сітуацыя з «Вагнерам» – досыць важная для большасці беларусаў. Стаўленне да ПВК «Вагнер» таксама моцна скарэляванае са знахожджаннем на шкале сацыяльнага канфлікту.

Мы паказалі рэспандэнтам сем выказванняў пра групу «Вагнер» (Табліца 4). Нават **Зацятыя прыхільнікі** рэжыму не выказваюць адназначнага даверу да групы «Вагнер» і не даюць ёй адназначна пазітыўнай ацэнкі. Адназначна негатыўна «Вагнер» успрымаюць толькі **Зацятыя праціўнікі**. **Схільныя не давяраць** таксама насцярожана ставяцца да групы «Вагнер». Усё гэта дазваляе казаць пра тое, што беларускае грамадства ставіцца да размяшчэння групы «Вагнер» у лепшым выпадку з сумневам. Гэта можна патлумачыць антываенным кансэнсусам. Жаданне пакінуць Беларусь па-за канфліктам адбіваецца на стаўленні да актыўных удзельнікаў гэтага канфлікту, адзін з каторых – ПВК «Вагнер», каго да таго ж не ясна, ці атрымалася б кантраляваць на тэрыторыі Беларусі.

### Табліца 4. Стаўленне да шэрага выказванняў пра групу «Вагнер» па сегментах сацыяльнага канфлікту

Значна больш, чым сярод іншых сегментаў (адзначана *)

| Выказванне пра групу «Вагнер» | Стаўленне да выказвання | Зацятыя прыхільнікі | Схільныя давяраць | Схільныя не давяраць | Зацятыя праціўнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| Размяшчэнне групы «Вагнер» узмоцніць бяспеку Беларусі | Цалкам згодныя | 17% | 7% | 1% | 0,0% |
| | Хутчэй згодныя | 30% | 25% | 10% | 1% |
| | Хутчэй не згодныя | 9% | 16% | 26%* | 5% |
| | Цалкам не згодныя | 4% | 7% | 28%* | 84%* |
| | Цяжка адказаць | 40%* | 46%* | 35% | 10% |
| Беларускай дзяржаве будзе складана кантраляваць групу «Вагнер» | Цалкам згодныя | 4% | 4% | 17%* | 64%* |
| | Хутчэй згодныя | 12% | 20% | 28%* | 20% |
| | Хутчэй не згодныя | 22% | 23% | 12% | 2% |
| | Цалкам не згодныя | 16% | 5% | 6% | 3% |
| | Цяжка адказаць | 46%* | 49%* | 37% | 12% |
| Група «Вагнер» – наўпроставая пагроза бяспецы Беларусі | Цалкам згодныя | 2% | 2% | 11% | 59%* |
| | Хутчэй згодныя | 7% | 11% | 23% | 21% |
| | Хутчэй не згодныя | 23%* | 28% | 16% | 2% |
| | Цалкам не згодныя | 33%* | 14% | 7% | 8% |
| | Цяжка адказаць | 36% | 45%* | 43%* | 10% |
| Байцы групы «Вагнер» здзяйснялі ваенныя злачынствы ва Украіне | Цалкам згодныя | 1% | 2% | 11% | 58%* |
| | Хутчэй згодныя | 5% | 6% | 21% | 13% |
| | Хутчэй не згодныя | 8% | 21% | 10% | 2% |
| | Цалкам не згодныя | 35% | 14% | 6% | 3% |
| | Цяжка адказаць | 51%* | 58%* | 53%* | 24% |
| Нават калі байцы групы «Вагнер» здзяйснялі ваенныя злачынствы ва Украіне, гэта дапушчальна | Цалкам згодныя | 7% | 3% | 2% | 3% |
| | Хутчэй згодныя | 20% | 16% | 6% | 1% |
| | Хутчэй не згодныя | 11% | 12% | 18% | 12% |
| | Цалкам не згодныя | 8% | 10% | 28% | 69%* |
| | Цяжка адказаць | 54%* | 59%* | 47%* | 16% |

| Выказванне пра групу «Вагнер» | Стаўленне да выказвання | Зацятыя прыхільнікі | Схільныя давяраць | Схільныя не давяраць | Зацятыя праціўнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| Байцы групы «Вагнер» у Беларусі будуць вернымі сваім камандуючым, а не кіраўніцтву Беларусі | Цалкам згодныя | 9% | 4% | 14% | 55% |
| | Хутчэй згодныя | 27% | 32% | 32% | 17% |
| | Хутчэй не згодныя | 14% | 11% | 9% | 2% |
| | Цалкам не згодныя | 3% | 2% | 4% | 5% |
| | Цяжка адказаць | 47% | 51% | 41% | 21% |

Перад вамі некалькі выказванняў пра групу (ПВК) «Вагнер». Наколькі вы згодныя ці не згодныя з імі?

Гэтая думка пацвярджаецца і размеркаваннем адказаў на пытанне, ці ўхваляюць рэспандэнты раскватараванне групы «Вагнер» у Беларусі: большасць беларусаў ці не можа адназначна адказаць на гэтае пытанне, ці выказваецца адмоўна (Малюнак 9). Сярод **Зацятых прыхільнікаў** менш за палову ў рознай ступені ўхваляюць размяшчэнне «Вагнера».

## Малюнак 9. Стаўленне да выказвання «Я ўхваляю размяшчэнне байцоў групы "Вагнер” у Беларусі»




Перад вамі выказванне пра групу (ПВК) «Вагнер». Наколькі вы згодныя ці не згодныя з ім?

Разам усё гэта значыць, што ў прапагандыстаў рэжыму не атрымалася «прадаць» беларусам групу «Вагнер», неглядзячы ні на шматлікія паездкі беларускіх сілавікоў і вайсковых у размяшчэнне вагнераўцаў, ні на медыйныя карцінкі з навучаннем беларускіх салдат. Такое стаўленне да групы «Вагнер» можа патлумачыць і негатыўную для рэжыму дынаміку ў сегментацыі сацыяльнага канфлікту. Мы мяркуем што, размяшчэнне ПВК «Вагнер» належыць інтэрпрэтаваць як дэ-факта парушэнне антываеннага кансэнсусу, што прыводзіць да больш насцярожанага стаўлення да рэжыму нават сярод людзей, схільных яму давяраць.

# 6 УЛАДА І ГРАМАДСТВА

Асноўныя трэнды ў працы рэпрэсіўнай сістэмы захоўваюцца, кіраўнікі сілавых структур сцвярджаюць намер яго не спыняць. Узмацняецца кантроль над грамадскай сферай, да дэманстрацыі «пакаяння» і нязгоды з «экстрэмізмам» пачынаюць дадаваць практыкі прымусу ваказвання сваёй згоды з палітыкай рэжыму. Улады робяць пэўныя захады па стварэнні новага «прыгоннага права» – асабістага падпарадкавання некаторых сацыяльна-прафесійных груп. У культурна-гістарычнай плашчыні галоўнымі ворагамі застаюцца праявы беларушчыны і яе галоўнае ўвасабленне – Кастусь Каліноўскі. Актывісцкі ўздым дыяспары, распачаты ўвесну, пакуль захоўвае свой маштаб, засяродзіўшыся на праблеме палітвязняў.

## ТРЭНДЫ РЭПРЭСІЎНЫХ ПРАКТЫК

Наладжаная за апошнія гады рэпрэсіўная сістэма рэжыму Лукашэнкі спраўна працягвае сваю працу. Фактычна ўсе датычныя да яе трэнды, што апісваліся ў папярэдніх выпусках Трэкеру, працягваюць дзейнічаць. Дасюль адбываюцца затрыманні і перазатрыманні як за выказванне салідарнасці з Украінай, так і за ўдзел у падзеях беларускай рэвалюцыі 2020-21 гадоў[128]. Людзей затрымліваюць і паасобку, і сем’ямі. Захоўваецца ціск на сваякоў (асноўная ўвага прыпадае на сем’і журналістаў, вядомых палітыкаў і беларускіх добраахвотнікаў, што ваюоць ва Украіне). Трывае пераслед пэўных прафесійных груп (галоўным чынам адвакатаў, журналістаў); у справаздачны перыяд ад пераследу асабліва цярпелі святары каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў.

Працягваюцца і так званыя «хапуны» – калектыўныя затрыманні і па месцы жыхарства (выглядае на тое, што лідарамі па затрыманнях сталі Гомель і Магілёў), і на працы. У апошнім выпадку спарадычная актывізацыя затрыманняў, як і звальненняў па палітычных матывах, звязаная з ініцыятывамі свежапрызначаных кіраўнікоў, што з’яўляюцца выхадцамі з сілавых структур (МУС ці КДБ). Трываюць і практыкі чыстак у прафесійным асяроддзі (напрыклад, сярод юрыстаў у фармаце кваліфікацыйных іспытаў)[129].

Захоўваецца тэндэнцыя затрыманняў на мяжы. Там працуе ўзмоцнены кантроль, у выніку якога праз праверкі тэлефонаў дзясяткі беларусаў трапляюць пад палітычны пераслед. Толькі ў чэрвені пасля затрымання на мяжы было асуджана як мінімум 36 чалавек, што вярталіся на радзіму[130].

У месцах зняволення ціск на палітвязняў застаецца і нават узмацняецца. Тут апошнім часам пачынае вымалёўвацца і новая тэндэнцыя – выкарыстанне практык карнай псіхіятрыі, калі палітычных зняволеных накіроўваюць на прымусовыя агляды ці лячэнне ў псіхіятрычныя клінікі (прыклады Паліны Шарэнды-Панасюк, Уладзіміра Кондруся, Валерыя Яроцкага, Ігара Папова). Праз мэтанакіраваны ціск і адмыслова створаныя невыносныя ўмовы ў месцах зняволення летам 2023 года павялічваецца пагроза для здароўя і жыцця людзей. Летам стала вядома, што ў няволі ўжо памерла некалькі чалавек. Самы вядомы выпадак – знакаміты

---

[128] Выглядае на тое, што звычайна падставамі для затрыманняў з’яўляюцца лічбавыя адбіткі, што пакідаюць людзі. Але здараецца і так, што штуршком для затрыманняў становяцца медыйныя імпрэзы тыпу з’яўлення на канале Delfi стужкі аб пратэстах 2020 года, пасля чаго сілавікамі, па іх словах, было ідэнтыфікавана больш за 10 чалавек.

[129] «Подтвердились все опасения». Юристы массово заваливают новый экзамен Минюста – что происходит? // Зеркало, август 2023

[130] Мінімум 36 асуджаных пасля затрымання на мяжы: вынікі адміністрацыйнага пераследу ў чэрвені // Вясна, ліпень 2023

беларускі мастак і акцыяніст Алесь Пушкін, які загінуў праз тое, што за кратамі яму не была аказана своечасовая медычная дапамога[131].

Агульна кажучы, працяг рэпрэсій ёсць цалкам заканамерным, бо гэта свядомая ўстаноўка беларускіх уладаў, про што сведчыць шэраг інтэрв'ю, якія давалі сілавікі гэтым летам[132][133][134]. У выніку рэалізацыі гэтай установкі за тры летнія месяцы па палітычных матывах было затрымана найменей 948 чалавек, прызнана экстрэмістамі - 90, палітзняволенымі - 69.

## УЗМАЦНЕННЕ СІСТЭМЫ КАНТРОЛЮ

Рэпрэсіі трэба разглядаць як адну з частак больш маштабнай сістэмы кантролю і прыгнёту грамадства з боку беларускага рэжыму. Пра намаганні ўлад па пашырэнні гэтай сістэмы мы таксама пісалі ў мінулых выпусках. Але зараз ёсць чым удакладніць гэты асноўны трэнд як мінімум у некалькіх накірунках.

Па-першае, нарматыўна-прававы ўзровень. Перадусім звяртае на сябе ўвагу зацверджаная ў чэрвені Канцэпцыя прававой палітыкі, якая дазваляе абмежаванне правоў чалавека «ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі». Да гэтага дададзім наступнае: а) падрыхтаваны праект змен у Жыллёвы кодэкс, згодна з якім правы таварыстваў уласнікаў кватэр будуць істотна абмежаваныя; б) вынесены на грамадскае абмеркаванне законапраект «Аб аўтамабільных перавозках пасажыраў», паводле якога будзе легалізавана сачэнне за пасажырамі таксі. Адзначым, што, хаця законапраект яшчэ не прыняты, відэакамеры ў аўтамабілі таксі ўжо пачалі ўсталёўваць. Прынамсі ўжо вядомыя такія захады ў Гродна[135]; в) падпісанне ўказа «Аб мерах па супрацьдзеянні несанкцыянаваным плацежным аперацыям»[136], паводле якога перад сілавікамі перастае працаваць прынцып «банкаўскай таямніцы».

Па-другое, працягвае пашырацца кантроль над рознымі арганізацыямі, таварыствамі і суполкамі. Гэта адбываецца як прыхаваным чынам, напрыклад, праз «прапановы супрацоўніцтва» (як у выпадку ДАСААФ і клубаў страйкбалістаў ці байкераў) ці шляхам прызначэння ў кіраўніцтва былых сілавікоў (гл. раздзел «Милитаризация: новые отряды спецназа…»), так і наўпрост праз рэструктурызацыю арганізацый, як гэта было са зменай структуры ОСВОД («Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах»), у выніку якой асобу на пасаду кіраўніка таварыства трэба ўзгадняць з Лукашэнкам. У складаных выпадках, калі наўпрост падпарадкаваць арганізацыі тэхнічна цяжка, разглядаюцца магчымасці іх (не)перарэгістрацыі[137] ці дадатковай акрэдытацыі спецыялістаў[138].

Па-трэцяе, пад ціскам дзяржавы растуць, хаця і паволі, практыкі як выказвання нязгоды з «экстрэмізмам», так і сцвярджэння сваёй лаяльнасці ўладзе. Тут шчыруюць прадстаўнікі адміністрацый дзяржаўных прадпрыемстваў і некаторыя энтузіясты рэжыму. Адны прымаюць удзел у арганізацыі адкрытых «судовых» паседжанняў ці робяць відэаролікі з заклікамі асудзіць сваіх працаўнікоў, затрыманых па палітычных артыкулах; прымушаюць вывешваць

---

[131] Алесь Пушкін // Вясна, 2023

[132] Карпянкоў заявіў, што гатовы пачаць паляванне на полк Каліноўскага // Наша Ніва, чэрвень 2023

[133] «Они начнут работать против нас». Замначальника ГУБОПиК рассказал, почему не хочет останавливать репрессии // Зеркало, август 2023

[134] Галоўны міліцыянер Гродзеншчыны пра палітычныя рэпрэсіі: «Не было такога дня, каб мы кагосьці не прыцягвалі» // Наша Ніва, жнівень 2023

[135] Паводле інфармацыі Hrodna.life, у некаторых гродзенскіх таксі ўжо з'явіліся камеры відэаназірання // Hrodna.life, чэрвень 2023

[136] «Предоставление информации правоохранителям не является нарушением банковской тайны». Силовики получат супердоступ к платежам белорусов // Зеркало, август 2023

[137] Як гэта ўжо адбылося з палітычнымі партыямі і можа адбыцца з рэлігійнымі арганізацыямі. Гл. Перарэгістрацыя рэлігійных арганізацый можа прайсці ў Беларусі // Наша Ніва, чэрвень 2023

[138] Власти взялись и за фитнес-инструкторов: теперь вы не сможете заниматься с самоучкой – тем более, если у него есть судимость за протесты // Зеркало, август 2023

чырвона-зялёныя сцягі на будынках[139] ці распрацоўваюць дэперсаналізаваную ўніформу для сваіх працаўнікоў і навучэнцаў. Другія вышукваюць любыя мажлівыя праявы іншадумства ва ўніверсітэтах, музеях, войску і гарадской прасторы.

## НОВАЕ «ПРЫГОННАЕ ПРАВА»

З сістэмы кантролю асобна трэба вылучыць шэраг захадаў, накіраваных на асабістае падпарадкаванне некаторых сацыяльна-прафесійных груп.

Па-першае, гэта прадстаўнікі сілавых органаў і дзяржслужачыя, пра ўвагу да якіх пісалася ў мінулых выпусках Трэкеру. Як мы казалі, улады распрацоўваюць розныя падыходы дзеля таго, каб не проста забяспечыць іх лаяльнасць, але і атрымаць дадатковыя інструменты для ціску на іх у выпадку магчымага непадпарадкавання.

Па-другое, гэта адукаваныя людзі, занятыя ці ў сельскай гаспадарцы, ці ў прэзідэнцкай вертыкалі. Падчас чарговага выступу Лукашэнка загадаў забараніць ім звальняцца ці пераводзіцца на іншую працу без дазволу старшыні райвыканкама. Лукашэнка сфармуляваў гэта такім чынам: «Сегодня ни один специалист, ни один руководитель сельхозпредприятия не может быть переведен на другую работу или уволиться без решения председателя райисполкома. Уволился – никто в стране не может его взять на работу, пока он с предыдущего места работы не представит справку, характеристику нормальную. И по вертикали. Ни один председатель райисполкома и прочие по их областному реестру тоже не может бросить работу»[140].

Да гэтых груп трэба дадаць агулам тых, хто мае намер – нават патэнцыйна – з'ехаць з краіны ці наўпрост перасекчы яе межы. Нагодамі для такіх падазрэнняў можа стаць інфармацыя аб замове апастыля на дакументы, падача дакументаў на візу ці атрыманне «карты паляка». Як наступства, людзі трапляюць пад пільную ўвагу кампетэнтных органаў. У адных выпадках такімі органамі становяцца адміністрацыі прадпрыемстваў (для прафілактычных размоў), у другіх – ваенкаматы (для позваў у армію), у трэціх – міліцыя ці КДБ (на размовы і кантроль).

Асабліва цынічны момант у пытанні аб адмове ў праве перасекчы беларускую мяжу – гэта блакіроўка беларускімі ўладамі магчымасцей аздараўлення за мяжой дзяцям з чарнобыльскіх тэрыторый[141].

## ГАЛОЎНЫ ВОРАГ – БЕЛАРУШЧЫНА

Па-ранейшаму любыя праявы таго, што выходзіць па-за межы савецка-расійскага гістарычнага і культурнага дыскурсу, прыхільнікі рэжыму разглядаюць як пагрозу. Галоўным ворагам у такой логіцы аказваюцца ўсе праявы беларушчыны. Цягам лета рэпрэсіўны ціск у гэтым рэчышчы быў скіраваны перш за ўсё на бібліятэкі, архівы і музеі.

Першым загадана прыбіраць з паліц працы Алексіевіч, Быкава, Геніюш, Някляева, Арсенневай (кнігі апошніх трох, як і частка творчасці Дуніна-Марцінкевіча, прызнаныя «экстрэмісцкімі»); а да электронных бібліятэк доступ абмяжоўваецца[142] . У другіх адбываецца ўзмоцненая «чыстка кадраў» ад нелаяльных уладзе працаўнікоў. З трэцімі здараюцца

---

[139] «Снимок сбросьте по факсу». Во Фрунзенском районе Минска от частников требуют высадить на территории цветы и вывесить флаг // Зеркало, июль 2023

[140] Лукашэнка: Ніхто ў калгасе не можа звольніцца без рашэння кіраўніка // Наша Нива, ліпень 2023

[141] «Minsk blocca i bimbi di Chernobyl»: lo strazio delle famiglie pugliesi // La Gazzetta del Mezzogiorno, ліпень 2023

[142] Мининформ заблокировал онлайн-библиотеку беларуской литературы kamunikat // Медиазона, июль 2023

скандалы, калі праўладныя актывісты там знаходзяць хоць нешта, што ўтрымлівае «Пагоню», спалучэнне бел-чырвона-белых колераў альбо ўзгадкі пра паўстанне 1863 году.

Увогуле паўстанне 1863-64 гадоў і яго правадыр Кастусь Каліноўскі з'яўляюцца ледзь не самымі адмоўнымі тэмамі ў гісторыі XIX стагоддзя. Цяпер узгадкі пра іх пільна адсочваюцца і знікаюць: на гістфаку БДУ знішчылі пано з выявай Каліноўскага; пад Баранавічамі знішчылі паштовую станцыю, у якой быў штаб паўстанцаў-каліноўцаў; у Гродне знік памятны знак у гонар паўстанцаў, а з бібліятэчнай сістэмы Гродна выдалілі біяграфію Каліноўскага.

Мэта гэтых захадаў улады – вынішчэнне ці прынамсі прыхаванне любой інфармацыі, якая праблематызуе «братэрскі» характар беларуска-расійскіх стасункаў. Замест гэтага рэжым працягвае прасоўваць ідэі «рускага свету» (у гэтым рэчышчы і ганяць постаць Каліноўскага, якога, напрыклад, намеснік сакратара Савета бяспекі РФ Аляксей Шаўцоў параўноўвае са Сцяпанам Бандэрам)[143]. Летам гэта адбывалася праз адмену беларускіх святых у РПЦ, замену беларускамоўных шыльдачак рускамоўнымі на Вайсковых могілках у Мінску, карэктыроўкі экскурсійных практык і закупку літаратуры пра Расію і Маскву ў бібліятэкі Беларусі.

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

Актывізацыя дзейнасці дыяспары, што распачалася ўвесну, працягнулася і летам. Асноўным яе напрамкам застаецца салідарнасць з Беларуссю. Але летам гэты напрамак удакладніўся, змясціўшы ў цэнтр сваёй увагі палітвязняў.

Беларусы замежжа ладзілі свае акцыі і запланавана, да пэўных каляндарных дат, і як рэакцыі на падзеі, што ўзрушылі беларускае грамадства. Адной з такіх буйных хваль акцый салідарнасці сталі мерапрыемствы ў памяць загінулага за кратамі мастака-палітвязня Алеся Пушкіна. Таксама спантанна было арганізавана масавае вывешванне беларускіх сцягоў у вокнах дамоў у Вільнюсе падчас саміту НАТА, які адбываўся ў сталіцы Літвы 11-12 ліпеня 2023 года.

Сярод заплаваных мерапрыемстваў вылучаецца перш за ўсё Дзень салідарнасці з Беларуссю, прымеркаваны да трэцяй гадавіны пачатку пратэстаў 2020-21 гадоў. У мерапрыемствах прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускай дыяспары шэрага краін Еўропы і Амерыкі. Але самай маштабнай імпрэзай лета 2023 года стаўся, безумоўна, марафон салідарнасці «Нам не ўсё адно!», мэтай якога быў збор сродкаў на патрэбы палітвязняў. На заклік прадстаўніцы Аб'яднанага пераходнага кабінета па сацыяльных справах адгукнулася 30 незалежных медыя, якія за два дні марафону сабралі больш за 500 000 еўра. Арганізатары адзначылі, што яны былі ўражаныя сабранай сумай, бо не разлічвалі на такую актыўнасць беларусаў. Асабліва падкрэслівалася, што ўдзел у марафоне прымалі не толькі беларусы замежжа, але і тыя, хто застаецца ў Беларусі[144].

Заўважым, што збор сродкаў падчас марафону салідарнасці з палітвязнямі – гэта не выключны выпадак беларускага фандрайзінгу. У жніўні, напрыклад, беларусы за мяжой збіралі сродкі на лячэнне палітвязню Віталю Тысеву і на падрыхтоўку да школы дзецям палітвязняў.

Праблема палітзняволеных была адной з галоўных і ў галіне стварэння новых арганізацый. Так, у чэрвені было абвешчана пра стварэнне асацыяцыі былых беларускіх палітвязняў «Вольны крок». Таксам з'явіўся праект «Вольныя», які дапамагае былым палітвязням з адаптацыяй.

[143] У Савеце бяспекі Расіі ўстурбаваліся постаццю Кастуся Каліноўскага // Еўрарадыё, жнівень 2023

[144] Наста Базар: «Людзі з Беларусі таксама знаходзілі спосабы далучыцца да марафона, прасілі сяброў і блізкіх па-за межамі краіны» // Салідарнасць, ліпень 2023

Асобна адзначым спробу грамадскай самаарганізацыі беларускіх добраахвотнікаў, што ваююць ва Украіне. 19-20 жніўня ў Кіеве адбыўся сход прадстаўнікоў беларускіх добраахвотніцкіх фармаванняў і шэрага грамадзянскіх і парамілітарных арганізацый. Яго адметнай асаблівасцю была адсутнасць прадстаўнікоў штаба Палка Кастуся Каліноўскага. Сярод галоўных вынікаў сустрэчы – арганізацыя дабрачыннага марафону для збору сродкаў сем'ям загінулых беларусаў, а таксама сацыяльная падтрымка ваяроў і іх сем'яў[145].

[145] «Не перасварыліся». У Кіеве прайшла закрытая сустрэча байцоў з усіх беларускіх фармаванняў, якія ваююць ва Украіне // Наша Ніва, жнівень 2023

# ТЭХНІЧНЫ ДАДАТАК

Для анализа динамики общественного мнения команда Беларусского трекера перемен заказывает опросы общественного мнения у двух поставщиков данных. Один из поставщиков является основным — его данные используются для подготовки раздела «Динамика общественного мнения». Второй поставщик —вспомогательный: анализируя его результаты, автор раздела проверяет, воспроизводятся ли тренды, заметные в данных основного поставщика, и во вспомогательных данных тоже. В первую очередь это касается анализа сегментов социального конфликта.

Ранее для сбора данных использовалась квотная выборка, предполагающая отображение структуры городского населения Беларуси с доступом в интернет по полу, возрасту, размеру населенного пункта и образованию. С четвертого выпуска команда Беларусского трекера перемен отказалась от квотирования и использует простую случайную выборку, нацеленную на отражение структуры онлайн-панели.

Поставщики рассылают 25000 приглашений случайным пользователям и держат исследование открытым ровно 7 дней.

Получившаяся выборка не является репрезентативной городскому населению Беларуси, но репрезентативна структуре онлайн--панелей.

Логика опроса Беларусского трекера перемен такова: значительные изменения или тренды в обществе будут отражаться на массиве в 70–100 тысяч участников панели, следовательно, случайный отбор небольшой выборки в ~1000 респондентов и взвешивание выборки по структуре онлайн--панели также отразят эти изменения.

В то же время можно с уверенностью рассуждать о тенденциях и феноменах внутри тех или иных изучаемых нами групп (сегментов) общества. Так, опрос делит общество на 4 сегмента, и можно утверждать, что наблюдаемые в исследовании присущие сегменту особенности характерны и для условных представителей этого сегмента во всем беларусском обществе.

При подготовке текущего отчета данные предыдущих выпусков Беларусского трекера перемен также были перевзвешены по структуре онлайн--панели и использованы для анализа динамики. Это значит, что остается вероятность, что динамика, наблюдаемая между первыми тремя и всеми последующими выпусками, обусловлена изменением подхода к выборке.

## ФАКТОР СТРАХА

Считая свои данные надежными и валидными, мы при этом признаем, что к данным, собранным с помощью опросов в Беларуси, нужно относиться с осторожностью. Распределение ответов в выборке может отличаться от реального в том числе и из-за репрессивных действий беларусских властей, которые вызывают повышенную тревожность при ответах на сенситивные вопросы.

Так, значительное количество респондентов прекратили прохождение опроса, увидев вопрос об одобрении деятельности Александра Лукашенко и правительства Беларуси. Это приводит к потенциальным искажениям распределений ответов в достигнутой выборке в сторону «нейтральности», а также к вымыванию из выборки нейтральных респондентов, острее реагирующих на сенситивные вопросы.

В данных основного поставщика мы наблюдаем т. н. dropout rate (отношение количества тех, кто прошел опрос до конца, к количеству тех, кто начал проходить опрос) в размере 18%.

Кроме того, не стоит забывать о природе онлайн-опроса, который отражает более экономически и социально активное городское население: вследствие этого можно предположить, что, вероятно, поддержка политики Александра Лукашенко среди выборки отличается от реальной.

### Табліца 5. Технические показатели сбора данных

| | Количество человек | Проценты |
|---|---|---|
| A1. Высланные приглашения | 2500 | |
| A2. Начавшие заполнять анкету | 1241 | |
| A3. Не прошедшие скрининговую часть анкеты | 78 | |
| A4. Бросившие анкету после скрининговой части | 208 | |
| A5. Прошедшие опрос до конца | 955 | |
| Response rate (A2/A1) | | 5% |
| Dropout rate (A4/(A2-A3)) | | 18% |

Ниже приведено сравнение структуры достигнутой выборки, разосланных приглашейни, структуры основной онлайн-панели и структуры городского населения Беларуси с доступом к интернету (Таблица 6).

### Табліца 6. Социально-демографическая структура

| | Высланные приглашения | Прошедшие опрос до конца | В структуре панели (цель для взвешивания) | В структуре горожан с доступом к интернету |
|---|---|---|---|---|
| | | **Возрастная группа** | | |
| 18-24 | 29% | 6% | 11% | 10% |
| 25-34 | 35% | 26% | 26% | 22% |
| 35-44 | 23% | 27% | 29% | 22% |
| 45+ | 12% | 41% | 33% | 45% |
| | | **Пол** | | |
| Мужской | 54% | 53% | 31% | 44% |
| Женский | 46% | 47% | 69% | 56% |
| | | **Регион** | | |
| Брестская обл. | 13% | 15% | 14% | 12% |
| Витебская обл. | 12% | 13% | 12% | 12% |
| Гомельская обл. | 15% | 18% | 15% | 14% |
| Гродненская обл. | 11% | 8% | 11% | 10% |
| Минская обл. | 15% | 13% | 15% | 10% |
| Могилевская обл. | 12% | 13% | 11% | 11% |
| г. Минск | 22% | 19% | 22% | 31% |

Также мы выкладываем в свободный доступ массивы данных, использованные для исследования: они будут доступны на сайте Беларуского трекера перемент bct.expert

# СЕГМЕНТЫ СОЦИАЛЬНОГО КОНФЛИКТА

В основе Сегментов социального конфликта (ССК) лежит оценка доверия людей к государственным и негосударственным институтам, а также к сторонникам и противникам власти. В ходе сбора данных респондентам предлагалось оценить, насколько они доверяют или не доверяют, например, «милиции» или «людям, которых называют политическими заключенными». Анализ этих оценок позволяет разделить беларусское общество на четыре группы, отличающиеся по степени доверия или недоверия к власти: **Ярые сторонники**, **Склонные доверять**, **Склонные не доверять**, **Ярые противники**. Почти для половины общества, которую составляют **Склонные не доверять** и **Ярые противники**, характерно недоверие к властным структурам. Вторую половину формируют **Склонные доверять** и **Ярые сторонники**. Сегменты сильно различаются по социально- демографическим признакам: среди **Ярых противников** значительно больше мужчин, больше образованных, представители сегмента чаще проживают в Минске и имеют более высокий доход. Среди представителей **Ярых сторонников**, наоборот, больше женщин. **Ярые сторонники** менее образованны, имеют доход ниже среднего. **Ярые сторонники** и **Склонные доверять** отличаются высоким доверием к провластным институтам и социальным группам, которые были выделены с помощью факторного анализа и определены как «сторонники власти».

Ниже приводится список институтов, людей или групп людей, которых мы просили оценить по шкале «полностью не доверяю — скорее не доверяю — скорее доверяю — полностью доверяю».

- Вооруженные силы;
- Милиция;
- Следственный комитет;
- Прокуратура;
- Комитет государственной безопасности;
- Государственные СМИ;
- Негосударственные СМИ;
- Правительство;
- Чиновники;
- Граждане Беларуси, которые уехали за границу, опасаясь преследования внутри страны;
- Лица, которые участвовали в акциях протеста летом и осенью 2020 года;
- Люди, которые не доверяют власти;
- Люди, которые доверяют власти;
- Сторонники действующей власти;
- Люди, которые не признают результаты президентских выборов 2020 года;
- Люди, которые признают результаты президентских выборов 2020 года;
- Лица, которых называют политическими заключенными.

# ШОСТЫ ВЫПУСК БЕЛАРУСКАГА ТРЭКЕРА ПЕРАМЕН

## ЧЭРВЕНЬ-ЖНІВЕНЬ 2023

Аўтары:
Павел Слюнькін
Арцём Шрайбман
Леў Львоўскі
Філіп Біканаў
Генадзь Коршунаў

Для сувязі:
filip.bikanau@gmail.com

УСЕ ВЫПУСКІ ДАСТУПНЫЯ НА САЙЦЕ: BCT.EXPERT